МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

27 студзеня 2016 г.
№ 2 (365)

ТЭМА ДНЯ

ЧАЛАВЕКУ ВАЖНА ПРОСТА ВЫГАВАРЫЦЦА

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

Дабрабыт людзей у многім залежыць ад таго, як працуе мясцовая ўлада, дэпутаты пярвічнага ўзроўню. Гэта самая блізкая да чалавека структура, па якой ён мяркуе аб сістэме дзяржаўнага кіравання ў цэлым. Часта чалавеку вельмі важна проста выгаварыцца, адчуць, што да яго патрэб ставяцца з разуменнем. Дэпутаты мясцовых Саветаў назапасілі шмат формаў двухбаковай сувязі са сваімі выбаршчыкамі, жыхарамі рэгіёнаў. І гэтыя «масткі» год ад года ўмацоўваюцца, удасканальваюцца. Але, як кажуць, межаў дасканаласці няма... Пра гэта яшчэ раз нагадала старшыням пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Святлана ГЕРАСІМОВІЧ падчас чарговай сустрэчы.

— У кожным сельскім Савеце прыняты і зацверджаны планы сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторый на 2016 год. Не проста планы, а праграма дзеянняў, па якой жыць і працаваць у бліжэйшай перспектыве. І вельмі важна, каб жыхары ведалі, якія змены чакаюць канкрэтныя тэрыторыі. Таму неабходна, каб гэтыя планы былі змешчаны на стэндах у даступных месцах, дзе найчасцей збіраюцца людзі. Прычым інфармацыя павінна быць распісана па кожным населеным пункце: што і калі будзе зроблена, з указаннем адказнай за выкананне асобы, — адзначыла Святлана Герасімовіч.

НЕ ПРАВЯРАЦЬ, А ДАПАМАГАЦЬ

Нагадала Святлана Міхайлаўна сваім калегам і пра тое, што сёлета па ініцыятыве Пастаяннай камісіі ў Законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» замацавалі норму аб правядзенні рэгіянальных сходаў дэпутатаў. Як паказала практыка, яны апраўдваюць сябе. На гэтую, так бы мовіць, раду збіраюцца дэпутаты, старасты вёсак, старэйшыны. «Такая форма работы аб'ядноўвае дэпутацкі корпус, павышае статус дэпутатаў пярвічнага звяна», — лічыць сенатар.

Па ініцыятыве Старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча на буйных прадпрыемствах працуюць дэпутацкія групы. У краіне іх 327. Дэпутаты наведваюць суб'екты гаспадарання, вывучаюць сітуацыю, ладзяць прыёмы грамадзян, сустрэчы з людзьмі, цікавяцца іх праблемамі.

Магчыма, пэўныя пытанні не вырашацца адразу. Але чалавек адчувае, што ён не абыякавы ўладзе, яго выслухалі. У полі зроку такіх мабільных фарміраванняў — пытанні працоўнай занятасці, своечасовай выплаты заработнай платы і г.д.

> Гэтыя групы выязджаюць на месцы не для таго, каб некага пакараць, а для таго, каб дапамагчы выправіць становішча.

Паляпшэннем фінансава-эканамічнага становішча прадпрыемстваў, сельгасарганізацый заклапочаны і маніторынгавыя групы. Такія фарміраванні створаны як на ўзроўні рэспублікі, так і абласцей.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ГІСТОРЫЯ Ў НАЗВАХ

ІМЁНЫ ДЛЯ ВУЛІЦ

Дэпутат Магілёўскага гарсавета Галіна Бяляева — пра тапаніміку і адказнасць перад выбаршчыкамі

Нэлі ЗІГУЛЯ

Для завуча магілёўскай СШ №34 Галіны БЯЛЯЕВАЙ праца ў складзе дэпутатаў гарадскога Савета 27 склікання — першы вопыт. Прызнаецца, што на рашэнне паспрабаваць сябе ў ролі народнага абранніка паўплывала імкненне нешта змяніць у грамадскім жыцці. «Кожны жыхар бачыць праблемы і нават ведае, як іх вырашыць, — кажа яна. — І я раней так думала. Разам з іншымі здзіўлялася: ну як гэта ўлады не заўважаюць такіх відавочных праблем, калі яны ляжаць на паверхні? Цяпер разумею, наколькі ж наіўная я была».

Што важнейшае: рамонт або здароўе?

— Чалавек, які ўпершыню прыходзіць у гэтую сферу, чымсьці нагадвае маладога максімаліста — я вось прыйшоў і ўсё вырашу, — усміхаецца яна. — Аказваецца, што бюджэт горада не гумовы, што існуюць яшчэ і іншыя, больш надзённыя, праблемы. І пачынаеш разумець, што горад чымсьці нагадвае... вялікую кватэру. Мы ў сваёй кватэры не можам вырашыць усе праблемы адначасова. У нас ёсць пэўны сямейны бюджэт. Мы мяркуем зрабіць рамонт на кухні і раптам аказваецца, што гэты рамонт не такі важны, як, напрыклад, здароўе кагосьці з членаў сям'і. І рамонт на кухні адкладваецца да лепшых часоў.

Падчас правядзення выніковых сесій у звычайнага чалавека складваецца ўражанне, што дэпутаты галасуюць за ўсё, што ім прапаноўваюць.

— Але гэта толькі так здаецца, — кажа суразмоўца. — Да таго, як прыйсці на сесію і прагаласаваць, вядзецца вялікая работа, задзейнічаны ўсе спецыялісты. Па 3-4 гадзіны, бывае, выпрацоўваюць рашэнне і кансенсусу не знаходзяць. Потым зноў збіраюцца — з запрашэннем дадатковых спецыялістаў. Ды і на выніковай сесіі, калі дэпутаты з чымсьці не згодныя, яны маюць права прагаласаваць супраць і выказаць свой пункт гледжання.

> З найбольш рэзанансных у Магілёве было перайменаванне плошчы Савецкай у плошчу Славы.

Галіна Бяляева працуе ў складзе камісіі па сацыяльных пытаннях. Магілёў пастаянна расце, пашыраецца, будуюцца цэлыя мікрараёны. З'яўляецца вострая неабходнасць у новых дзіцячых садках, школах, паліклініках. І гэтыя пытанні таксама на павестцы дня магілёўскіх дэпутатаў. Але кожны разумее, што прапановы іншых камісій не менш важныя. Таму на сумесных пасяджэннях трэба вызначаць прыярытэты. Летась такой галоўнай задачай стала рэканструкцыя Дняпроўскага моста 1959 года пабудовы, які звязвае цэнтральную магістраль двух раёнаў Магілёва — Кастрычніцкага і Ленінскага.

Падыход да лакальных пытанняў гараджан не менш важны.

— Часцей за ўсё выбаршчыкаў хвалююць пытанні, якія мы аднеслі б да кампетэнцыі ЖЭУ, — кажа Галіна Бяляева. — Яны ў большасці датычацца канкрэтнага дома і вуліцы. (Напрыклад, хутчэй бы нам пачысцілі дарогу ад снегу.) Мы агітуем народ не быць спажыўцамі, запрашаем таксама прымаць удзел у ачыстцы. Бывае, частка жыхароў дома церпіць ад суседзяў, якія наогул не жадаюць нічога рабіць, іх усё і так задавальняе. І тады нас запрашаюць выступіць пасрэднікамі паміж аднымі і другімі.

Вуліца Ленінская за час свайго існавання неаднойчы мяняла назву (была Вялікай Садовай, Ветранай, Інжынернай...).

Была плошча Савецкая, стала — Славы

Гісторык па адукацыі, Галіна Бяляева мінулым Магілёва цікавілася, напэўна, з маленства. Яна і зараз у вольны час распрацоўвае камп'ютарныя праграмы, прысвечаныя гісторыі Магілёва. (Зараз — гэта віртуальны тур па галоўнай плошчы горада — Славы. А у адной з апошніх даследчых работ вучняў 34-й школы на тэму магілёўскіх вуліц настаўніца выступіла кансультантам.)

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

КАЛІ ДЗЯКУЮЦЬ, АСАБЛІВА ПРЫЕМНА

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Інэса Кляшчук — пра вырашальныя і невырашальныя праблемы

Дэпутатам Інэса КЛЯШЧУК стала ў 30 гадоў. Паколькі да прыходу ў Нацыянальны сход яна працавала першым сакратаром Слуцкага гарадскога камітэта ГА «БРСМ», то і ў сваёй парламенцкай дзейнасці працягвае цікавіцца маладзёжнымі праблемамі. У мінулым годзе член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Інэса Кляшчук стала старшынёй Рэспубліканскага маладзёжнага савета пры міністру адукацыі.

— Я заўсёды казала і буду казаць: моладзь у нас добрая — ініцыятыўная, актыўная. Калі параўноўваць пакаленні, то цяперашняе — больш прагрэсіўнае. Па-першае, тэхналогіі ідуць наперад, моладзь лёгка іх асвойвае і прымяняе. Па-другое, сучасная моладзь мэтанакіраваная, ведае, як арганізаваць свой час. Калі параўноўваць з 90-мі, то тады вучыцца было не вельмі модна. Сёння ж маладыя людзі, наадварот, імкнуцца атрымаць добрую адукацыю.

У нашай краіне, на мой погляд, створаны аптымальныя ўмовы для самарэалізацыі маладых людзей — як у прафесійным, так і ў грамадскім, асабістым плане. Але, як вядома, моладзь больш падвяргаецца ўплыву, таму ў маладзёжным асяроддзі ёсць, натуральна, і праблемы, якія аператыўна вырашаюцца на ўзроўні ўрада, парламента, кіраўніка дзяржавы. Дарэчы, калі ў 2009 годзе прымаўся праект закона «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», то з моладдзю нашага раёна мы яго абмяркоўвалі. Часткова прапановы былі ўлічаны.

— Кожны дэпутат мае свае формы працы з людзьмі. Можа, падзеліцеся ўласным вопытам?

— Мая акруга — Слуцкая выбарчая №67 — уключае ў сябе горад Слуцк і 9 сельсаветаў Слуцкага раёна. Кожны месяц арганізоўваю прыёмы грамадзян і ў горадзе, і ў сельскай мясцовасці, сустракаюся з працоўнымі калектывамі прадпрыемстваў і ўстаноў. Падчас работы ў сельсаветах не абмяжоўваюся толькі прыёмамі грамадзян — заходжу на малочнатаварныя фермы, на мехдвор, наведваю ўстановы аховы здароўя, дзіцячыя садкі, школы... Расказваю людзям пра законапраекты, над якімі працую, выслухоўваю іх праблемы і пажаданні.

Як правіла, пры арганізацыі сустрэч з выбаршчыкамі мы працуем сумесна з дэпутатамі мясцовых Саветаў. Потым разам з аддзеламі раённага выканаўчага камітэта, адпаведнымі арганізацыямі агучаныя праблемы імкнёмся вырашаць. Натуральна, не ўсё атрымліваецца адразу — некаторыя звароты патрабуюць значных грашовых затрат, тое ж добраўпарадкаванне дарог.

Трэба разумець, што многія праблемы, з якімі звяртаюцца грамадзяне, дэпутат не можа вырашыць самастойна. Таму я вельмі ўдзячная ўсім тым, хто садзейнічае ў вырашэнні такіх пытанняў — Слуцкаму райвыканкаму, яго аддзелам і службам, Савету дэпутатаў, кіраўнікам арганізацый, абласным структурам, рэспубліканскім органам дзяржаўнай улады і проста грамадзянам, якія аказваюць падтрымку, напрыклад, у плане спонсарства.

> Мы звярталіся ў Міністэрства аховы здароўя, працавалі і непасрэдна з рэктарамі ВНУ... Зараз у раёне ўжо не такая вострая запатрабаванасць у кадрах.

Узгадваю рэспубліканскую дабрачынную акцыю «Спартсмены — дзецям», якая мінулай зімой прайшла ў Слуцку. У ёй прынялі ўдзел знакамітыя беларускія спартсмены — чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў у Сочы па фрыстайле Ала Цупер, чэмпіён Алімпійскіх гульняў у Барселоне па гандболе Андрэй Барбашынскі, чэмпіён СССР футбаліст Андрэй Зыгмантовіч... На свята былі запрошаны выхаванцы сацыяльных устаноў, прыёмныя, апякунскія сем'і, навучэнцы ўстаноў адукацыі, спартыўных устаноў. Сустрэча атрымалася запамінальнай, хвалюючай і кранальнай.

— З якімі просьбамі прыходзяць да дэпутата?

— Большасць зваротаў — прыкладна 40% — традыцыйна тычыцца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкавання дарог і паляпшэння жыллёвых умоў.

Адна з самых значных праблем, якую ўдалося вырашыць, — гэта будаўніцтва наплаўнога моста паміж вёскай Вялікі Быкоў і аграгарадком Ісерна, дзе працякае рака Случ. Наплаўны мост там дэмантавалі, і для таго, каб жыхарам адной вёскі трапіць у другую, трэба было рабіць круг — кіламетраў 18. Каб апрацаваць палі, што знаходзяцца па розныя бакі ракі, — таксама. Гэта нязручна і неэканамічна.

Колішні наплаўны мост быў устаноўлены пры дапамозе ваенных, таму і цяпер асабіста звярнулася да міністра абароны, абазначыла праблему. У выніку супрацоўніцтва з Міністэрствам абароны, яго Дэпартаментам транспартнага забеспячэння, 30-й асобнай Чырванасцяжнай чыгуначнай брыгадай, райвыканкамам, ААТ «Ісерна» мост устанавілі. Грамадзяне былі вельмі ўдзячныя.

Разам з галоўным урачом нашай цэнтральнай бальніцы вырашалі пытанне па забеспячэнні медыцынскімі кадрамі. Гэтая праблема характэрная не толькі для нашага раёна — вузкіх спецыялістаў не хапае шмат дзе. На працягу трох гадоў пытаннем займаліся. У выніку працаваць да нас прыехалі як ураджэнцы Слуцкага раёна, так і іншых. Мы звярталіся ў Міністэрства аховы здароўя, працавалі і непасрэдна з рэктарамі ВНУ... Зараз у раёне ўжо не такая вострая запатрабаванасць у кадрах.

Людзі прыходзяць і з самымі простымі, элементарнымі просьбамі. Восенню на прыём завітаў мужчына і паскардзіўся на аварыйнае дрэва насупраць яго дома: ён баяўся, што пры моцным ветры яно можа ўпасці. Я звярнулася ў адпаведныя службы, і дрэва зрэзалі — чалавек прыйшоў падзякаваць — гэта асабліва прыемна.

— У якіх выпадках дапамагчы чалавеку, які звярнуўся да дэпутата, складана?

— Найбольш складаныя звароты аб вызначэнні мяжы паміж суседскімі зямельнымі ўчасткамі — такія праблемы пераходзяць у шматгадовыя канфлікты. На мой погляд, у такіх сітуацыях заўсёды можна знайсці кампраміс, але людзі часцяком прынцыпова не хочуць ісці на ўступкі. Былі звароты аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў і афармленні апякунства, аказанні дапамогі бацькам, дзеці якіх знаходзяцца за мяжой. Такія сітуацыі «цяжкія» ў маральным плане, паколькі хочацца, каб сямейныя каштоўнасці не страчваліся.

— Выбаршчыкі вашай акругі цікавяцца заканатворчай працай?

— Сапраўды, грамадзяне ўносяць прапановы па заканадаўстве. Напрыклад, выкарыстоўваць сродкі, атрыманыя ад дзяржаўнай пошліны за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху, на бягучы рамонт дарог. Што цікава, гэта прапанова ўжо выкарыстана дэпутатамі і рэалізавана ў Законе «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2016 год».

Былі прапановы і наконт карэкціроўкі Дэкрэта Прэзідэнта «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства». Я іх накіравала ў Пастаянную камісію па працы і сацыяльных пытаннях. Акрамя таго, выбаршчыкі просяць зрабіць больш жорсткай адказнасць за курэнне ў грамадскіх месцах...

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ЯК РЭАЛІЗАВАЦЬ ІДЭЮ

У гэтым дапаможа праект «Прыватна-дзяржаўнае партнёрства ў інтарэсах устойлівага развіцця сельскіх раёнаў Беларусі», які атрымаў старт адразу ў трох раёнах Магілёўскай вобласці — Краснапольскім, Слаўгарадскім і Быхаўскім.

— У сельскай мясцовасці хапае ініцыятыўных людзей, трэба толькі дапамагчы ім увасобіць іх лепшыя ідэі ў жыццё, — адзначыла **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Таццяна КАНАНЧУК**, якая прымае актыўны ўдзел у рэалізацыі праекта.

Падчас арганізацыйнага сходу ў Слаўгарадскім раёне прадстаўнікі выканаўчай і заканадаўчай галін улады трох раёнаў, а таксама ўсе зацікаўленыя асобы абмеркавалі перспектывы развіцця гэтага праекта. Ён будзе рэалізоўвацца Міжнародным фондам развіцця сельскіх тэрыторый пры падтрымцы Праграмы малых грантаў. У Краснаполлі, Слаўгарадзе і Быхаве ў хуткім часе з'явяцца цэнтры развіцця, якія будуць дапамагаць мясцовым арганізацыям і ініцыятыўным грамадзянам распрацоўваць карысныя праекты, а таксама прыцягваць рэсурсы для іхажыццяўлення. Першы міжраённы кірмаш, дзе будуць прадстаўлены найбольш абгрунтаваныя ініцыятывы, адбудзецца сёлета ў маі ў Слаўгарадскім раёне.

Дарэчы, у Краснапольскім раёне ужо існуе добры прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства. З 2014 года тут пры дапамозе Міжнароднага фонду развіцця сельскіх тэрыторый і актыўным удзеле мясцовых дэпутатаў рэалізуецца праект «Зялёная эканоміка саду для адраджэння вёскі («Дрэвы супраць беднасці і дэградацыі зямлі»). За 2 гады яго існавання ўдзел у ім прынялі Пачапоўскі дзіцячы садок-школа і каля 20 сям'яў. Цяпер ужо яны дапамагаюць іншым сем'ям і ўстановам паляпшаць сваю эканоміку за кошт вырошчвання пладовых дрэў і ягадных кустоў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

СВЯТЛО Ў АКНЕ

І АДСТУПАЕ АДЗІНОТА...

Калі цёпла і ў доме, і на душы

Барыс ПРАКОПЧЫК

На Гродзеншчыне актыўна развіваюць адносна новую форму сацыяльных паслуг — дамы самастойнага сумеснага пражывання пажылых людзей. Такіх дамоў у вобласці цяпер 13 (на 84 месцы) і яшчэ 3 запланавалі стварыць сёлета. Па адным з падобных адрасоў на Зэльвеншчыне накіраваўся наш карэспандэнт.

Па дарозе ў вёску Акцябрскую **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Зэльвенскага райвыканкама Наталля ЮРКЕВІЧ** і **дырэктар раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Святлана ЖАМОЙЦІНА** расказалі, што дом самастойнага сумеснага пражывання для адзінокіх грамадзян ствараўся па прынцыпе «пры мінімальных расходах — максімальны эфект». Што маецца на ўвазе?

Калісьці ў раёне былі дзве базы ПМК, адна з якіх размяшчалася ў Акцябрскай. Вакол яе пабудавалі рабочы пасёлак з двухпавярховых дамоў. Калі ж вытворчай базы там не стала, з'явіліся незанятыя кватэры. На першым паверсе аднаго з двухпавярховікаў аказаліся пустымі тры з чатырох кватэр і іх перадалі Цэнтру сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Зэльвенскага раёна. Кватэры і інжынерныя камунікацыі капітальна адрамантавалі (100 мільёнаў рублёў выдзеліла вобласць і 50 мільёнаў рублёў — раённы бюджэт), забяспечылі новым сантэхнічным і кухонным абсталяваннем, мэбляй. Дапамогу аказалі Гродзенскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў, раённы прафсаюз работнікаў АПК, абласныя арганізацыі Чырвонага Крыжа і Фонда міру. Работнікі сацыяльнай службы самі паклеілі ў гэтых кватэрах шпалеры. А на ўваходзіны прыехалі прадстаўнікі ўсіх арганізацый — зразумела, не з пустымі рукамі: кожны падарыў нешта патрэбнае ў гаспадарцы.

Дом самастойнага сумеснага пражывання ў Акцябрскай разлічаны на 7 чалавек. Зараз там жывуць тры жанчыны і мужчына, а яшчэ двое пастаяльцаў туды вернуцца пасля лячэння ў бальніцы. У асноўным гэта людзі, якія не маюць дзяцей альбо па тых ці іншых прычынах не падтрымліваюць з імі пастаянных кантактаў. Кватэры знаходзяцца на балансе раённага ўпраўлення ЖКГ, якое заключыла з кожным чалавекам дагавор найму жылога памяшкання. Сістэма разліку за жыллёва-камунальныя паслугі, па сутнасці, такая ж, як і ўсюды.

> На першым паверсе аднаго з двухпавярховікаў аказаліся пустымі тры з чатырох кватэр, і іх перадалі Цэнтру сацыяльнага абслугоўвання.

Плюс аплата паслуг сацыяльнага работніка — гэтыя абавязкі тут выконвае **Ганна ЖАК**. Атрымаў пенсію, зрабіў абавязковыя выплаты — астатняй сумай распараджайся як хочаш. Зразумела, прадукты, лекі, нешта іншае трэба купляць.

Сацыяльны работнік Ганна ЖАК разам са сваёй падапечнай Марыяй ЗЕЛЯНКО.

Фота Наталлі МАЦЮК.

Наша першая суразмоўца — **Марыя ЗЕЛЯНКО**. Яе хата непадалёк, у вёсцы Галынка, а ў гэтым доме Марыя Антонаўна тры месяцы. Прыйшла сюды на зіму, хоць, магчыма, застанецца і надалей, бо жыць адной інваліду першай групы цяжка. А тут ні пра ацяпленне не трэба клапаціцца, ні пра харчаванне.

— Мне вельмі падабаецца. Цёпла, чыста. Ёсць тэлевізар, радыё. Жанчына, якая нас абслугоўвае, чалавек цудоўны. І з іншымі людзьмі, хто тут жыве, адносіны нармальныя, бо навошта нам сварыцца? — гаворыць Марыя Антонаўна.

Гэтак жа пазітыўна, нягледзячы на свае хваробы, настроена і 82-гадовая **Клаўдзія ГАЛЕНДА**. Яна ў гэтым доме з самага адкрыцця і жартам называе яго «курортам». Клаўдзія Ільінічна таксама вельмі ўдзячная сацыяльнаму работніку Ганне Жак:

— Усё зробіць, што папросіш. А сёння нават вадохрышчанскай вадзічкі нам з храма прынесла.

У Клаўдзіі Ільінічны сваіх дзяцей няма, але вырасціла чужых, і яны сваю «другую маму» не забываюць — пастаянна наведваюць яе ў Акцябрскай.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)